**УДК 94(476/5)”11/12”**

# ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ З ЗЕМЛЯМІ-КНЯСТВАМІ НА ТЭРЫТОРЫІ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ Ў 1180-1240-Я ГГ.

***М.П. КРУПСКІ,***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. Д.В. ДУК)***

У 1162 г. на полацкім стале зацвярдзіўся Усяслаў Васількавіч, які быў запрошаны полацкім веча з Віцебска. Полацкая зямля перажывала не самыя спакойныя часы, а таму была вымушаная шукаць саюзнікаў. Усяслаў Васількавіч знаходзіўся ў сваяцкіх адносінах са смаленскім князем Давыдам Расціславічам. Менавіта гэты накірунак быў выбраны для аб'яднання сіл у барацьбе з суседзямі. За дапамогу ў ваеннай справе смаленскі князь запатрабаваў Віцебск. Пад 1165 г. у летапісу знаходзім: «Давид Ростиславич седее витебьски» [1]. Аднак варта адзначыць, што Віцебск перадаваўся Смаленску ў часовае валоданне. Што мы і ўбачым у далейшай гісторыі ўзаемаадносін Полацка і Смаленска. Менавіта ў гэтым Л. В. Аляксееў бачыў пачатак распаду Полацкага княства [2, с. 275], а І. Ц. Бяляеў [3] і В.Я. Данілевіч [4] увогулі лічылі поўную страту незалежнасці Полацкім княствам. В. Л. Насевіч не выключае часовай залежнасці Полацка ад Смаленска. Спасылаючыся на тое, што гандлёвае пагадненне з Рыгай 1229 г. Мсціслаў Давыдавіч, тагачасны вялікі князь Смаленска, палпісваў ад імя Смаленска, Полацка і Віцебска [5, с. 15]. Варта адзначыць дальнавіднасць полацкага веча. Няма падстаў сумнявацца, што вялікі князь прымаў рашэнне аб перадачы ў часовае валоданне Віцебскам са згоды веча. Гэта была тонкая дэпламатыя тых часоў, якая на той момант апраўдала сябе поўнасцю.

М. Ермаловіч робіць акцэнт на тое, што пасля паражэння 1180 г. пад Друцкам, Смаленск, страціўшы палітычны ўплыў на полацкія справы, мог аб’яднаць свае сілы з другой пераможанай кааліцыяй, а менавіта з менскімі Глебавічамі, якія пасля паражэння Валадара ў 1167 г. апынуліся на другарадных ролях [6, с. 239]. Магчыма, пры падтрымцы Давыда Смаленскага –аднаму з іх – сыну Валадара Глебавіча Васільку – удалося захапіць лагожскі пасад, дзе ў 1180 г. мы бачым Усяслава Мікуліча.

Пад 1182 г. В. Н. Тацішчаў называе менскага князя Уладзімірам [7, с. 127], і гэта відавочна нейкая галіна менскіх Глебавічаў. Лаўрэнцьеўскі летапіс, паведамляючы аб паходзе на Полацк кааліцыі князёў на чале з Давыдам Расціславічам Смаленскім і яго сынам наўгародскім Мсціславам (ім дапамагалі і полацкія князі - Васілька Валадаравіч Лагожскі і Усяслаў, відавочна, Глебавіч Друцкі) нават не згадвае імя полацкага князя. Летапісец у апошні раз згадвае Усяслава Васількавіча як полацкага князя пад 1186 г. [8, с. 13]. Пры гэтым у Генрыха Латвійскага знаходзім, што біскуп Мейнард спрашваў дазвол на хрышчэнне ліваў у тым жа 1186 г. у полацкага караля Уладзіміра. Магчыма, гэта сын Усяслава Васількавіча, і атрымаў ён Полацк пасля бацькі ў 1186 г. [2, с. 15]. Летапіс не супярэчыць «Хроніцы»; у паходзе на Полацк 1186 г. ён згадвае друцкага Усяслава, які, такім чынам, саступае полацкі пасад Уладзіміру. Усяслаў становіцца друцкім князям. Можна выказаць здагадку і пагадзіцца з Л. В. Аляксеевым, што найбольш верагодна з'яўленне ў Полацку Уладзіміра пры пераразмеркаванні сталоў - Друцк трапіў да менскіх Глебавічаў [2, с. 282].

У 1186 г. палачане - зноў у саюзе з Ольгавічамі - ваююць са смаленскім князем за Віцебск, але беспаспяхова. У надзеі вярнуць горад, яны ў 1196 г. выступілі супраць смаленскага князя і змаглі нанесці паражэнне яго тысяцкаму Міхаілу.

«Слова пра паход Ігараў» прыгадала ў бітве з літоўцамі аднаго з заходнерускіх князёў – Ізяслава Васількавіча якое, па здагадцы Э. М. Загарульскага, магло адбыцца паміж 1180 і 1185 гг. [9, с. 120]. Варта адзначыць, што гэта адзіны князь, якога не ведаюць летапісы. Звесткі аб ім знаходзім толькі ў «Слове». Ізяслаў загінуў у баі, не атрымаўшы дапамогі ад сваіх полацка-віцебскіх братоў Брачыслава і Усевалада: «Уже Сула не течетъ серебристыми струями къ городу Переяславлю; Двина уже болотомъ течетъ къ тѣмъ грознымъ Половчанамъ при восклицанїи нечестивыхъ. Одинъ только Изьяславъ сынъ Васильковъ позвенѣлъ своими острыми мечами по шлемамъ Литовскимъ; помрачилъ славу дѣда своего Всеслава, и самъ подъ багряными щитами на окровавленной травѣ погибъ отъ мечей Литовскихъ. На семъ-то одрѣ лежа, произнесъ онъ: «Дружину твою, Князь, птицы прїодѣли крыльями, а звѣри кровь полизали» [10, с. 21].

У гістарычнай літаратуры і некаторых каментарыях да «Слова» аб Ізяславе гаворыцца як аб невядомым князе з Гродна на Нёмане. У якасці доказу звычайна спасылаюцца на фразу пра «гарадзенскія трубы», якія трубілі з нагоды гібелі князя. Правамернасць такой здагадкі выцякала таксама з таго, што Гродна як горад быў вядомы ўжо з 1128 г., а мяркуючы па археалагічных дадзеных, паўстаў яшчэ раней (другая палова XI ст.). Аднак такая здагадка ці ледзь дакладна. Вядома, што Гродна ніколі не належаў полацкім князям. Згаданыя ў летапісах гарадзенскія князі Усевалад Давыдавіч і яго сын Барыс (згаданы

пад 1150 г.) былі родам з дынастыі валынскіх князёў Ігаравічаў. Сярод іх не было князя, якога звалі Васілька, які мог бы быць бацькам Ізяслава. Між тым «Слова» прама называе Ізяслава Васількавіча нашчадкам полацкага князя Усяслава. Такім чынам, больш лагічна шукаць яго сярод полацкіх Усяславічаў, тым больш, што сярод полацкіх гарадоў летапіс пад 1158 г. называе Гарадзец. У «Хроніцы Быхаўца» Гарадзец названы таксама Гарадзенем [11].

Менавіта таму, большасць даследчыкаў, схільныя лічыць Ізяслава сынам полацкага князя Васількі Святаславіча, у якога, мяркуючы па летапісных дадзеных, было тры сына і дачка. Сыноў звалі Усяслаў, Брачыслаў, Валадар. Характэрна, што і ў «Слове» згаданы адзін з братоў Ізяслава пад імем Брачыслаў. Але «Слова» называе яшчэ аднаго брата – Усевалада, пра якога дагэтуль нічога не гавораць летапісы. Трэба параўнаць: у М. К. Гудзія «Не бысть ту брата Брячяслава, ни другаго Всеслава… [6, с. 65] і першапачатковы тэкст: “І не было тутъ братьевъ ни Брячислава, ни Всеволода” [10, с. 21].

В. Я. Данілевіч і В. І. Сцялецкі лічаць, што адзін з сыноў Васількі - Валадар мог мець і другое імя, якое даецца пры хрышчэнні – Усевалад. Аднак гэта толькі здагадкі. Разыходжанні паміж летапісамі і «Словам» досыць відавочныя. Да таго ж вядома, што Гарадзец, ніколі не належаў полацкім Васількавічам, а быў валоданнем менскіх Глебавічаў. Як лічыць Э. М. Загарульскі, усё гэта, пабуждае шукаць Ізяслава Васількавіча сярод нашчадкаў менскага князя Глеба Усяславіча [9, с. 123].

Пра князя Ізяслава Васількавіча паведамляе і другі аўтар, А. І. Суднік, які называе яго князем невялікага гарадка Полацкай зямлі, братам полацкай князёўны Марыі Васількаўны, якая была жонкай Святаслава Кіеўскага. Надзел якога быў недзе на памежжы з літоўскай зямлёй, чым і тлумачацца іх ваенныя сутычкі [12, с. 21].

Далейшыя летапісныя звесткі пра Полацк становяцца яшчэ больш рэдкімі і мала зразумелымі. Так, паведамленне Наўгародскага летапісу пад 1191 г. паведамляе: «ходя князь Ярославъ на Лукы позванъ Полотьскою княжьею и Полоцяны и поя съ собою Новъгородьць передньнюю дружину; и съняшася на рубежи, и положиша межи собою любъвь, яко на зиму всъмъ сънятися любо на Литву, любо на Чюдь; и пріде князь Новугороду Ярославъ одаренъ» [13, с. 164]. З летапіса відаць, што гэта сустрэча з Яраславам Уладзіміравічам была ініцыявана менавіта палачанамі. В. Я. Данілевіч лічыў, што Полацк, які нібыта паранейшаму быў у залежнасці ад Смаленска, што з’яўлялася яму ў цяжар, рашыў зблізіцца з Ноўгарадам, на свабоду якога таксама рабілі замах смаленскія Расціславічы, і што, такім чынам, гэта сустрэча была накіравана супроць Смаленска [4, с. 102]. Аднак, з гэтым меркаваннем нельга згадзіцца. Вынікі гэтай сустрэчы гавораць аб іншам. У сваю чаргу Ноўгарад, за згоду змагацца супроць Смаленска, мог паставіць перад палачанамі ўмову найперш прыняць удзел у супольным паходзе супроць літвы і чудзі [14, с. 243-244]. Існуе і іншая версія тых падзей. У. Ц. Пашута, прыхільнак думкі што ў той час літва пачала мацнець, а Полацк наадварот слабеў, сцвярджаў, што палачане, хацелі ў асобе наўгародцаў, знайсці сабе саюзнікаў супроць літвы і нават эстаў (чудзі) [15, с. 259 – 264]. На першы погляд гэта як быццам так, бо палачане сапраўды былі ініцыятарамі сустрэчы. Аднак з далейшага тэксту мы даведваемся пра паход Яраслава на чудзь з наўгародцамі і пскоўцамі, але пра паход на літву нічога не гаворыцца. І гэта закрэслівае думкі У. Ц. Пашуты.

Спробы Полацка скласці ваенны саюз з Ноўгарадам у 1191 г. засталіся безвыніковымі. У 1195 г. склаліся такія палітычныя абставіны, што Полацкай зямлі саюзнікам зноў, як і ў 1180 г. становяцца чарнігаўскія князі. Але калі ў 1180 г. спрэчкі былі за Друцк, то цяпер за Віцебск. Падрабязных звестак пра прычыны раздору летапісы не паведамляюць.

Пад 1195 г. у Іпацьеўскім летапісу знаходзім: «Ѩрослав же не дождавъ рѧдоу посла сн҃овцѧ своѩ ко Витебьскоу на зѧтѧ на Дв҃да” [1, сл. 691]. І зноў такі пад 1196 г. ніякіх звестак пра Полацкую зямлю няма. У сваю чаргу, Ніканаўскі летапіс падае нам гэтыя падзеі пад 1196 г., а не пад 1195 г., як кажа пра іх М. Ермаловіч. “Князь велики же Черниговскій Ярославъ Всеволодичь з братею своею … посла къ Витепску на великого князя Смоленскаго Давида Ростиславичя; … Князь же Мстиславъ Романовичь самъ поиде на полкъ Олговъ Святославичя Черниговскаго; и потопьта, и сына его князя Давида раниша. а тысяцкій князя Давида Смоленьскаго Михалко Яковличь той поиде противу Полочянь” [16, с. 27]. У Лаўрэнцьеўскім летапісу пад 1196 г. знаходзім той жа запіс [17, с. 174].

Яшчэ большую заблытанасць уносіць запіс пад 1197 г. Радзівілаўскага летапісу, які паведамляе нам пра межусобіцу паміж князем Давыдам Смаленскім з Раманам Чарнігаўскім «В лъто 6705 (1197) … Тое же зимы посла Давыдъ ис Смоленьска сыновца своего Мстислава, свата великого князя Всеволода, в помочь зятю на Витбескъ, и победи я Василко с черниговци, и Мстислава, свата княжа, взяша и ведоша его к Черниву» [18, с. 158]. З прыведзенага ўрыўка мы бачым, что баявыя дзеянні праходзілі недзе каля Віцебска. Трэба адзначыць што на гэты ўрывак Радзівілаўскага летапісу даследчыкі не дастаткова звярнулі ўвагу. Г. В. Штыхаў тлумачыць гэту дату тым, што яшчэ ў 1178 г. наўгародскі князь Мсціслаў Расціславіч задумаў паход супраць Усяслава Васількавіча, але потым пагадзіўся на мір пры

садзейнічанні смаленскага князя. Праз некаторы час пагоршыліся адносіны са Смаленскам, і паміж імі адбыўся ваенны канфлікт [8, с. 13].

Але ўсё ж трэба выказаць здагадку, што апісваюцца аднолькавыя падзеі аднаго ваеннага пахода. Высвятліць дакладную дату складана ў сувязі з вышэйпералічанымі супярэчнасцямі.

Чарнігаўскае войска, не дайшоўшы да Віцебска, пачало рабаваць Смаленскую зямлю. У адказ на гэта, Давыд паслаў супроць Ольгавічаў свайго пляменніка Мсціслава Раманавіча, а таксама Расціслава Уладзіміравіча і разанскага князя Глеба. Чарнігаўцы ў сутычцы са смаленскім войскам дзейнічалі вельмі асцярожна, і ў бой уступілі не адразу. У адрозненні ад чарнігаўцаў, смаленцы дзейнічалі інакш. Мсціслаў Раманавіч, які камандаваў смаленскім войскам, як толькі ўбачыў ворагаў, адразу кінуўся ў бой. Але нас больш цікавяць дзеянні палачан, супраць якіх быў накіраваны смаленскі полк, на чале з тысяцкім Міхалкам. Смаленцы адступілі, яшчэ не дайшоўшы да палачан. Тым самым палачане, зноў без асобых страт, атрымалі перамогу. І пры гэтым, яшчэ змаглі прыйсці на дапамогу сваім саюзнікам, чарнігаўцам, якія былі пацiснуты войскам Мсціслава Раманавіча. Палачане змаглі ўзяць у палон смаленскага князя. Іншыя смаленскія князі і іх саюзнікі, якія таксама вярнуліся з пагоні за чарнігаўцамі, убачылі, што частка войска разбіта. У страху пабеглі ў Смаленск. Такім чынам, полацкае войска адыграла вырашальную ролю ў разгроме смаленскага войска [14, с. 248].

Выкарыстаўшы паражэнне Смаленска, Полацк аднавіў у хуткім часе свае напады на Ноўгарад. Як ужо узгадвалася вышэй, у 1191 г. была спроба збліжэння Полацка і Ноўгарада, якая скончылася безвынікова. Магчыма з-за таго, што Ноўгарад навязваў Полацку паход на літву, саюзніка Полацкай дзяржавы. Аб тым, што гэта менавіта так, пацвердзілі падзеі восені 1198 г., калі палачане разам з літвою напалі на Вялікія Лукі, якія, бясспрэчна, былі стратэгічна важным цэнтрам Ноўгарада ў барацьбе са сваімі супернікамі. Трэба думаць, што гэты напад для наўгародцаў не быў нечаканым, бо яшчэ ў 1196 г., па сведчанням В. Н. Тацішчава, наўгародскаму князю Яраславу было згадана ісці ў Вялікія Лукі, абараняць мяжу з Полацкім княствам [7, с. 162].

Адказ Ноўгарада не прымусіў сябе доўга чакаць. Так, ужо зімою 1198-1199 гг. Ноўгарад збірае сілы, каб адпомсціць Полацку. Наўгародскі летапіс сведчыць, што апроч саміх наўгародцаў, у войску былі пскоўцы, наваторжцы, ладажане [16, с. 44]. Далей вельмі коратка летапіс паведамляе, што палачане прыйшлі да возера Каспля і з паклонам сустрэлі наўгародцаў і падпісалі мір з імі. Хоць наўгародцы і сабралі пэўныя сілы, але, не будучы ў саюзе са Смаленскам, як гэта было ў 1186 г., не маглі адчуваць сябе ўпэўнена ў сутычцы з палачанамі і таму ахвотна згадзіліся на мір.

Гэтая падзея – апошняя з зарэгістраваных крыніцамі ў гісторыі Полацкай зямлі XII ст. Як бачым, кіеўска-наўгародскія летапісы не адлюстроўваюць усіх падзей, якія адбыліся за гэты перыяд у Полацку і яго акругах. Магчыма шмат адказаў гісторыкі змаглі бы атрымаць пры наяўнасці Полацкага летапіса, які магчыма знік, і на сённяшні дзень не знойдзен. Але якімі б не былі адрывістымі звесткі пра Полацк у канцы XII ст., усё ж трэба зробіць галоўны вынік, а менавіта: аб умацаванні і адзінстве Полацкай дзяржавы ў яе гістарычным развіцці. Падзеі полацкай гісторыі 80 – 90 гг. XII ст. для нас важныя яшчэ і тым, што абвяргаюць усе домыслы аб знікненні полацкай княскай дынастыі і яе ўлады ў Полацку пасля 1191 г., у выніку чаго палачане нібыта кіравалі толькі вечам і мужамі, накшталт Ноўгарада і Пскова. Менавіта ў гэты час, паводле "Хронікі Быхаўца" [11] і М. Стрыйкоўскага [19], літоўскі князь Мінгайла і захапіў Полацк, разбіўшы войска апошняга пад Гарадцом, пасля чаго ў Полацкай зямлі замацавалася літоўская дынастыя князёў. Што ў сваю чаргу з'яўляецца вельмі спрэчным фактам.

Трэба аддаць належнае за захаванне звестак з гісторыі Полацкага княства даследчыку В. Н. Тацішчаву. Які пад 1217 г., у сваёй працы «История Российская» [7], размясціў «Аповесць пра Святохну». Гэтае апавяданне мае шмат агульнага са звесткамі, якія апісваў Генрых Латвійскі, у сваёй "Хронiцы". Адзін з галоўных герояў апавядання князь Барыс Давыдавіч Полацкі, па сцвярджэнню Л. В. Аляксеева быў тым самым Барысам, сынам Давыда Расціславіча Смаленскага [2, с. 287], які упамянуты ў летапісу пад 1195 г. як друцкі князь [1, с. 692].

«Аповесць пра Святохну» ўяўляе сабой самастойны літаратурны твор з поўным сюжэтам. Асаблівую аповесць, дзе выведзены яркія вобразы герояў, раскрываюцца іх характары, падрабязна апісваюцца не толькі ўчынкі, але таксама намеры і перажыванні людзей, гучыць прамая гаворка [20, с. 3]. Менавіта дзякуючы В. Н. Тацішчаву, мы маем магчымасць сберагчы гэты вельмі значны кавалак некалі агульнай гісторыі нашай, роднай Полацкай зямлі. Вялікая колькасць крытычных публікацый, якія з'явіліся пасля выхаду ў свет «Истории Российской» В. Н. Тацішчава не маюць дзейсных довадаў і былі абвергнутыя прафесарам А. В. Маёравым, у яго артыкуле «Из истории белорусского летописания: Полоцкая летопись В. Н. Татищева» [20; 21].

Л. В. Аляксееў асоба адзначае сувязі, а дакладней нават залежнасці, паходаў паўднёварускіх князёў у літоўска-яцвяжскія землі, ад адносін гэтых князёў з полацкімі князямі ў X - першай трэці XII стст. Кіеўскія князі аддавалі перавагу рабіць гэтыя паходы толькі тады, калі ў іх былі нямірныя адносіны

з полацкімі князямі. З гэтага вынікала выснова, што полацкія князі самі былі зацікаўлены ў атрыманні даніны з літоўскіх плямёнаў.

З 1180-х гадоў становішча моцна мяняецца. Нашы летапісныя крыніцы ўсё часцей паведамляюць аб паходах літоўскіх войскаў у рускія землі, пачынаючы з пскоўскіх і наўгародскіх зямель. У сярэдзіне-другой паловы XII ст. (1162, 1180, 1198 гг.) літоўскія злучэнні яшчэ прымаюць удзел у барацьбе князёў Полацка-Менскіх зямель. Аднак пачынаючы з XIII ст. гэтых фактаў ужо няма. У Літве стваралася сваё дзяржаўнае аб'яднанне ў форме феадальнай манархіі. "Литва, – піша У. Ц. Пашута, – принадлежит к числу тех восточноевропейских стран, в которых процесс борьбы за создание государства нашел более подробное отражение в источниках лишь на той стадии, когда развитие литовской монархии стало вопросом международной политики", т.е. тогда, когда эта борьба затронула соседние страны и там это отразилось в источниках. Захват Беларуси литовскими феодалами положил начало превращению небольшого Литовского государства в Литовское Великое княжество" [15, с. 368].

У 1252 г. "изгна Миндогъ сыновца своего Тевтевила и Едивида пославшомоу на воиноу со воемь своими на воиноу со Выконтомъ на Русь воевать ко Смоленьскоу" [22, стб. 814]. Трэба меркаваць, што гэтыя два князі, і дзядзька і Вікінт, занялі на некаторы час спадарожныя гарады: Полацк, Віцебск і Смаленск, але тады гэта было часова [23, с. 20-21; 2, с. 287-288].

Узаемаадносіны Полацка з літвой кардынальным чынам змяніліся пасля з'яўлення ў Прыбалтыцы каталіцкіх місіянераў і Ордэна, які стаў прадстаўляць небяспеку не толькі для рускіх княстваў - але і ў яшчэ большай ступені - для літоўскіх плямёнаў. Гэта акалічнасць была адной з прычын, якія паскорылі аб'яднанне літоўскіх плямёнаў і ўзнікненне ў іх дзяржавы. Перад тварам нямецкай небяспекі, ва ўмовах складаных і няроўных адносін са Смаленскім княствам полацкія князі вымушаны былі кансалідавацца з літвой. Асаблівую зацікаўленасць у гэтым саюзе адчувалі рускія князі ніжнедзвінскіх крэпасцяў, якія прынялі на сябе першыя ўдары крыжакоў. Цалкам можна пагадзіцца з меркаваннем Э. М. Загарульскага які лічыць, што для ўмацавання саюза з літоўцамі, князь Герцыке Усевалад ажаніўся з дачкой аднаго з магутнейшых літоўскіх князёў [9, с. 123-124],

«Хроніка» Генрыха Латвійскага [24] паведамляе, што Ўсевалад увесь час атрымліваў ад літоўцаў прадукты харчавання. У 1203 г. літоўцы дапамагалі рускім, якія аблажылі Рыгу. Пазней, у 1214 г, яны дапамаглі рускім адбіць у немцаў захоплены імі Герцыке. У 1221 г. літоўцы падтрымалі ваенныя дзеянні ноўгарадцаў супраць нямецкай крэпасці Вэнда.

Аднак узаемаадносіны з літвой далёка не заўсёды былі сяброўскімі. Так, у перыяд барацьбы князёў з Ордэнам, літоўцы неаднаразова нападалі на ўладанне Полацкага княства крэпасць Кукенойс. Заключыўшы перамір'е з немцамі, літоўцы выкарыстоўвалі перадышку для рабаўніцкіх паходаў супраць рускіх абласцей. Літва змагла абараніць сваю незалежнасць у барацьбе з нямецкім націскам Ордэна дзякуючы таму, што абапіралася на эканамічную і ваенную моц Заходняй Русі. Набіраючы сілу, літва, неўзабаве стала прадстаўляць рэальную пагрозу для рускіх зямель.

Безумоўна, патрабуе асаблівай увагі канцэпцыя аб кантынуітэце паміж полацкай дзяржаўнасцю і Вялікага княства Літоўскага, аналізаванню якой шмат увагі прысвяціў І. А. Марзалюк [25, с. 52 – 59], створаную І. В. Турчыновічам. Менавіта каланізацыя палачанамі зямель часткі Верхняй Літвы прывяла да таго, як сцвярджае сам аўтар, што частка насельніцтва Літвы Завілейскай складалася з крывічоў. Таму і паўстала тут ядро новай дзяржавы, якое спачатку было Літоўска-Крыўскім, ці Літоўска-Рускім [26, с. 60-61].

Падобныя разважанні былі характэрныя і для М. В. Каяловіча. Важнейшым магістральным пунктам беларускай гісторыі, лічыў даследчык, было збліжэнне беларускіх зямель з Літвой, якое пачалося ў полацкі перыяд беларускай гісторыі. Гэта знайшло адлюстраванне ў каланізацыі продкамі беларусаў – крывічамі і дрыгавічамі – зямель літоўцаў і яцвягаў [27, с. 60-61]. Пранікненне беларусаў у літоўскія землі. Іх каланізацыя, прыводзілі да агульнага збліжэння двух народаў. У першую чаргу гэта тычылася супольных вайсковых паходаў, скарыстання літоўскіх дружын полацкімі князямі падчас войнаў. З канца XII ст. і да сярэдзіны XIII ст. (да часоў мангольскага нашэсця) літоўскія дружыны пастаянна нападалі на землі Пскова, Ноўгарада, Цверы, што, паводле М. В. Каяловіча, адбывалася толькі ў выпадку дапамогі літоўцам з боку беларускіх зямель, якія не чынілі ніякіх перашкод апошнім, бо ў іх вачах яны былі сваімі [27, с. 64].

Адсюль і ўзнікненне ВКЛ паказваецца як супольная справа беларусаў і літоўцаў. Пры гэтым, падкрэслівае М. В. Каяловіч, дзяржаватворчымі кампанентамі новай дзяржаўнасці выступаюць, з аднаго боку, беларусы, а з другога – аўкштайты (верхнія літоўцы – па яго тэрміналогіі). Уласна літоўцы (аўкштайты) на момант стварэння дзяржаўнасці былі добра знаёмы з культурай, мовай і рэлігіяй беларусаў, лёгка яе засвойвалі і выступалі пасрэднікамі ў перадачы гэтых здабыткаў "чыстым" балцкім літоўцам-паганцам – жмудзінам. Усё згаданае абумовіла бесканфліктнасць у стварэнні ВКЛ і адсутнасць антаганізму паміж усходнімі славянамі-беларусамі і балтамі-літоўцамі [27, с. 75-76, с. 88].

Заходняя Русь, падзеленая на дробныя надзелы, якая была да таго ж і аслабленая бясконцымі ўсобіцамі з князямі, страціўшымі сілу і аўтарытэт у сваіх удзелах. Нягледзячы на несумненны эканамічны і культурны прагрэс, апынуліся няздольныя аб'яднаць свае сілы для захавання палітычнай самастойнасці і сталі ахвярай новага дзяржаўнага ўтварэння - Вялікага княства Літоўскага.

У Ноўгарадскім летапісе ёсць указанне, што Таўцівіл быў прыняты на княжанне самімі палачанамі, а не навязаны ВКЛ. Калі ў 1263 г. Транята забіў Таўцівіла і патрабаваў ад палачанаў выдычы яго сына, то апошні ўцёк са сваімі прыбліжанымі да Ноўгарада. “Тогда Литва посадиша своего князя в Полочькъ; а полочанъ пустиша, коих бяху поимал с княземь их, и миръ взяша” [28, с. 84, 313]. Гэта азначае, што аб трывалым уваходзе Полацка пад палітычны ўплыў ВКЛ можна казаць толькі ад 1263 г. [29, с. 189]. Але трэба асобна адзначыць, што Полацкая дзяржава захавала шырокую аўтаномію ў складзе ВКЛ [29, с. 189].

Так скончыўся старажытнарускі перыяд незалежнасці Полацкіх зямель - яны, як і Турава-Пінскія землі, адпаведна і ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі, надоўга ўвайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Менавіта да сярэдзіны XIII ст. можна з упэўненасцю казаць пра ўваходжанне ў склад ВКЛ Полацкага княства. З чым згодны шэраг даследчыкаў, сярод якіх М. А. Філіповіч [30, с. 61], У.Ц. Пашута[15, с. 259-264] і іншыя.

У Полацку зацвердзіўся князь Таўцівіл, хоць Міндоўг, натыкнуўшыся на супраціў Даніла Галіцкага, ачысціў Смаленск і Віцебск. У 1258 г. "Приидоша Литва с полочаны къ Смоленьску и взяша Воищину на щитъ" [9, с. 310]. Гэта князь Таўцівіл, валодаў цяпер Полацкам і "палачанамі", накіраваўся захапіць Смаленск (а затым разрабаваў і Таржок). Трэба сказаць, што, жанаты на сястры Данілы Галіцкага, Таўцівіл прыняў праваслаўе, быў саюзнікам свайго цесця ў барацьбе з узбуджанай немцамі Літвой, пазней прызнаў уладу Аляксандра Неўскага, удзельнічаў у барацьбе апошняга з немцамі. У некралагічным запісу аб забойстве Таўцівіла, наўгародскі летапісец называе яго, у 1263 г. як "добра князя Полотьского" і цалкам на яго баку [9, с. 84; 8, с. 14].

Літоўскія змоўшчыкі, пасля забойства Міндоўга расправіліся і з полацкім князем Таўцівілам, а яго сын са сваёй дружынай атрымаў прытулак у Ноўгарадзе. Да ўлады ў ВКЛ прыйшоў сын Міндоўга Войшалк, які пачаў расправу з кроўнымі ворагамі. Гэта заахвоціла частку літоўскіх князёў з дружынамі бегчы ў Пскоў. Са змовай супраць Міндоўга гістарыяграфічная традыцыя звязвае атрыманне пскоўскім сталом у 1266 г. літоўскім князям Даўмонтам. Магчыма таму, замацаваўшыся ў Пскове, Даўмонт у тым жа 1266 г. распачаў два пахода ў Полацк, захапіў жонку Гердзеня (полацкага намесніка Войшалка), а самога Гердзеня забіў [4, с. 180-181]. Дзеянні Даўмонта імпанавалі пскавічам, а ў наступных 1267 і 1268 гг. ужо наўгародцы падтрымалі Даўмонта ў яго паходах на полацкую тэрыторыю, імкнучыся аслабіць свайго патэнцыйнага праціўніка. Пераход у 1270-х гадах Полацка пад уладу Рыжскага біскупа на чвэрць стагоддзя вывеў горад з-пад кантролю Літвы і адсунуў напружанасць у памежных полацка-наўгародска-цвярскіх землях да XIV ст. [31, с. 66].

Трэба згадзіцца з думкай Г. В. Штыхава, які лічыць аб’яднанне беларускіх і літоўскіх зямель у адну дзяржаву, як вынік сацыяльна-эканамічных з’яў, якія адбываліся ў гэтых землях [32, с. 73-74]. Але асаблівасцю ўтварэння беларуска-літоўскай краіны была перавага палітычных прычын над эканамічнымі. Неабходнасць барацьбы са знешней небяспекай значна паскорыла і зрабіла неабходным аб’яднанне літоўцаў і беларусаў у адной дзяржаве, якая з’явілася з захаду ад нямецкіх феадалаў і з усходу ад мангола-татарскай навалы.

Дасягнуты ўзровень сацыяльнага і палітычнага развіцця ўсходнеславянскіх зямель у Верхнім Панямонні стаў падмуркам дзяржаваўтваральных працэсаў, якія абумовілі ўзнікненне беларуска-літоўскай дзяржавы. Агульны ход гістарычных падзей у другой палове XII ст. пацвердзіў унутраную стабільнасць гэтай дзяржавы, дзе вярхоўная ўлада мела апору ў беларускім і літоўскім баярстве, у народных апалчэннях беларускіх гарадоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Полное собраніе Русскихъ лѣтописей. Изданное по Высочайшему повелѣнию Археографическою коммиссеію. Томъ второй. Изданіе второе. Лѣтопись по Ипатскому списку. С-Петербургъ. Типографія М.А. Александрова. – 1908. – 638 с.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля. (Очерки истории Северной Белоруссии). В IX – XIII вв. – М. : Наука. 1935. – 295 с. : ил.
3. Беляев, Д.И. Исторія Полотска, или Сѣверо-Западной Руси, отъ древнѣйшихъ временъ до Люблинской уніи / Д.И. Беляев. – М. : Въ Синодальной Типографіи. – 1872. – 456 с.
4. Данилевичъ, В.Е. Очеркъ исторіи Полоцкой земли до конца XIV столѣтія / В.Е. Данилевичъ.– Кіевъ : Типографія императ. ун-та Св. Владіміра В. І. Завадскаго, Больш.-Васильковская, д. №№ 29-31. 1896. – 260 с.
5. Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. – Мінск : Полымя, 1993. – 160 с.; іл.

6. Гудзий, Н.К. Хрестоматия по Древней русской литературе XI – XVII веков : для высш. учеб. Заведений / сост. Н.К. Гудзий. – Изд. пятое, исп. и доп. – М. : Гос. учеб.-пед. изд-во Мин-ва просвещения РСФСР, 1952. – 546 с.
7. Исторія Россійская съ самыхъ древнейшихъ временъ неусыпными трудами черезъ тритцать лѣтъ собранная и описанная покойнымъ тайнымъ совѣтникомъ и Астраханскимъ губернаторомъ Васильемъ Никитичемъ Татищевымъ. Книга третія. – Напечатана при Московскомъ Императорскомъ университетѣ, 1774 г. – 530 с.
8. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 133, [2] с.
9. Загорульский, Э.М. Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века / Э. М. Загорульский ; вступ. ст. В.А. Тепловой. – Изд. второе, доп. – Минск : Четыре четверти, 2014. – 532 с. : ил.
10. Булахов, М.Г. «Слово о плъку Игоревѣ» в переводах на славянские языки XIX-XX вв. / М.Г. Булахов. – Минск : Беларус. навука, 2013. – 360 с.
11. Полное собрание Русских летописей. Литовсько-білоруські літописи. Том XXXII. Передмова до тому М.М. Улащик. 1975. – 430 с.
12. Полоцкая княжна Мария Васильковна – автор «Слова о полку Игореве»: исследования тайнописи / вст. сл. Л.Ф. Данько, А.И. Судника. – Полоцк : А.И. Судник, 2008. – 53 с. : ил. – (Наследие Полоцкой земли ; вып. 6).
13. Новгородская лѣтопись по синодальному харатейному списку. – Санктпетербургъ : Типографія Императорской Академіи наукъ. – 1888. – 560 с.
14. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полац. і новагард. перыяды / М.І. Ермаловіч, прадм. ; М. Ткачова. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 366 с. : іл.
15. Пашуто, В.Т. Внешняя политика Древней Руси / В.Т. Пашуто. – М. : Наука, 1968. – 472 с.
16. Полное собраніе Русскихъ лѣтописей. Изданное по Высочайшему повелѣнію Археографическою коммиссеію. Томъ десятый. VII. Лѣтописный сборникъ, именуемый Патріаршею или Никоновскою лѣтописью. Въ тіпографіи Министерства внутреннихъ делъ. – Санктпетербургъ, 1885. – 244 с.
17. Полное собраніе Русскихъ лѣтописей. Изданное по Высочайшему повелѣнію Археографическою коммиссеію. Томъ первый. II Лаврентіевская и Троицкая лѣтописи. – Санктпетербургъ, 1846. – 267 с.
18. Полное собрание русских летописей. Том тридцать восьмой. Радзивиловская летопись. – Л. : Наука, 1989. – 177 с.
19. Рогов, А.И. Русско-польские культурные связи в эпоху Возрождения (Стрыйковский и его Хроника) / А.И. Рогов ; отв. ред. М.Н. Тихомиров ; Акад. наук СССР, Ин-т Славяноведения. – М. : Наука, 1966. – 315 с.
20. Майоров, А.В. Из истории белорусского летописания: Полоцкая летопись В.Н. Татищева / А.В. Майоров // Вест. ПГУ. Серия А, Гуманитар. науки. – № 1. – 2005.
21. Майоров, А.В. Из истории белорусского летописания: Полоцкая летопись В.Н. Татищева / А.В. Майоров // Вест. ПГУ. Серия А, Гуманитар. науки. – № 7. – 2005.
22. Полное собраніе Русскихъ лѣтописей. Изданное по Высочайшему повелѣнію Археографическою коммиссеію. Томъ 2. Лѣтопись по Ипатскому списку. – Санктпетербургъ, 1871. – 616 с.
23. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси : очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л.В. Алексеев ; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2006. – Кн. 2. – 2006. – 167 с.
24. Генрих Латвийский. Хроника Ливонии / введ., пер. и коммент. С.А. Аннинского ; предисл. В.А. Быстрянского. – Л., 1938. – 607 с.
25. Марзалюк, І.А. Вобраз полацкай дзяржаўнасці ў беларускім гістарычным наратыве XIX – пачатку XX ст. Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22-23 мая 2012 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Полацкі дзярж. ун-т ; рэдкал. : А.А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В.М. Ляўко. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 639 с. : іл.
26. Турчиновичъ, И.В. Обозреніе исторіи Бѣлоруссіи съ древнѣйшихъ временъ. Сочиненіе И.В. Турчиновича. Изданіе В.А. Исанова. – Санктпетербургъ : Въ типографіи Эдуарда Праца. – 1857. – 303 с.
27. Коялович, М.И. Чтение по истории западной России / М.И. Коялович. – Минск, 2006.
28. Новгородская Первая летопись старшего и младшего изводов / под ре. и с предисл. А.Н. Насонова. – М. : Изд-во Аккад. наук СССР, 1959 ; Л. – 568 с. : ил.
29. Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А.К. Краўцэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 208 с.
30. Філіповіч, М.А. Полоцька зямля у білорусько-литовській літописній традиціі. Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22-23 мая 2012 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Полацкі дзярж. ун-т ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В.М. Ляўко. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 639 с. : іл.
31. Левко, О.Н. Полоцк – центр земли в XI – XIII вв. Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX – XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV – XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О.Н. Левко [и др.] ; ред. кол. : А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. Акад. Наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 743 с. : ил. – (Древнейшие города Беларуси).
32. Штыхаў, Г.В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. Серыя “Гісторыя Бацькаўшчыны” : дадатак да часопіса “Права і эканоміка”. – Мінск, 1999. – 76 с.